ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ




# МЕДЫЙНЫ ВОБРАЗ БЕЛАРУСІ ЗА МЯЖОЙ У 2022–2023 гг.: МАНІТОРЫНГ ЗАМЕЖНЫХ СМІ

Леся Руднік

Цэнтр новых ідэй | Люты 2024

# УВОДЗІНЫ

Медыі з’яўляюцца моцным актарам у дэмакратычных грамадствах. Праз медыі грамадзяне фармуюць сваё ўяўленне пра падзеі ў свеце, выпрацоўваюць стаўленне да палітыкаў. Разумеючы гэта, у межах маніторынгу вобраза Беларусі ў замежных СМІ, мы імкнёмся акрэсліць, як навакольны свет бачыць Беларусь, беларусаў і падзеі, якія адбываюцца вакол нашай краіны.

Беларусь прыцягнула ўвагу медыяў на кароткі час у 2020-ым годзе, калі актыўная фаза пратэстаў ахапіла краіну. Аднак як гэта часта адбываецца на медыйным рынку, цікавасць да нашай краіны паступова змяншалася. Выбухалі новыя міжнародныя крызісы, пратэсты, канфлікты, нават войны. Беларусь вярнулася ў фокус замежных медыяў у 2022-ім годзе. Аднак гэтым разам у цэнтры ўвагі стала ваенная ўцягнутасць беларускага рэжыму ў агрэсію Расеі супраць Украіны. Міграцыйны крызіс на мяжы з ЕС стаў яшчэ адной тэмай, якая закранался ў дачыненні Беларусі. Гэтыя і іншыя трэнды адлюстраваныя ў маніторынгу замежных медыяў 2021-2022 гг.

У другой палове 2022-га–першай палове 2023-га працягнулася вайна ва Украіне, якая абвастралася праз мяцеж Прыгожына, удзел Лукашэнкі ў вырашэнні лёсу ПВК “Вагнер”, размяшчэнне ў Беларусі ядравай зброі і ўзмацненне вонкавых сувязяў беларускага рэжыму з Расеяй, Кітаем і Іранам. Акрамя таго, беларускі рэжым працягнуў курс на пашырэнне рэпрэсій, русіфікацыю і ідэалагізацыю ўсіх сфераў грамадства. Разам з тым дэмакратычныя сілы выбудоўвалі новыя сувязі з замежнымі партнёрамі, наладжвалі стратэгічны дыялог з ЗША, дамагаліся прыняцця рэзалюцый па Беларусі і развіцця сеткі парламенцкіх групаў у падтрымку Беларусі. На фоне ўскладнення легалізацыі беларусаў у некаторых еўрапейскіх краінах дэмакратычныя сілы анансавалі праект новага пашпарта.

У межах маніторынгу мы прааналізавалі 20 міжнародных медыярэсурсаў і паглядзелі на тое, якія вобразы беларусаў, уладаў, дэмакратычных сілаў і дыяспары транслююць замежныя выданні ў кантэксце сённяшніх унутры- і знешнепалітычных падзеяў (гл. метадалогію маніторынгу на старонцы 11).

# ЯК ЗАМЕЖНЫЯ СМІ АСВЯТЛЯЛІ ПАДЗЕІ Ў БЕЛАРУСІ Ў 2022-2023 ГГ.?

У 2022-2023 гадах Беларусь прываблівала ўвагу міжнародных СМІ праз уцягнутасць рэжыму ў ваенныя дзеі на тэрыторыі Украіны, унутрыпалітычны крызіс і міжнародную актыўнасць дэмакратычных сілаў. У цэнтры ўвагі за прааналізаваны перыяд апынуліся такія падзеі, як мяцеж Прыгожына і роля Лукашэнкі ў далейшым яго развіцці, сустрэчы Пуціна і Лукашэнкі, размяшчэнне ядравай зброі ў Беларусі, міжнародныя візіты Святланы Ціханоўскай. Меншая ўвага за апошні год надавалася пытанню палітвязняў. Аднак міжнародныя СМІ пісалі аб адсутнасці сувязі з вядомымі палітзняволенымі, такімі як Марыя Калеснікава, Мікалай Статкевіч, Віктар Бабарыка, Сяргей Ціханоўскі і Максім Знак.

Найбольш папулярнымі тэмамі ў замежных выданнях у дачыненні Беларусі сталі: асоба Лукашэнкі, вобраз уладаў/рэжыму, а таксама стасункі Лукашэнкі і Пуціна. Найменш заўважныя тэмы: добраахвотнікі, валанцёры, партызаны, вобраз дэмакратычных сілаў і Святлана Ціханоўская. Таксама агулам знізілася глыбіня расповеду пра Беларусь: артыкулы часта падаюць краіну як другаснага актара ў агрэсіі Расеі супраць Украіны, абмінаюцца дэталі і кантэкст падзеяў 2020-га года.

**Графік 1а: Пра што найчасцей пісалі замежныя СМІ ў дачыненні Беларусі? ***




**Графік 1б: Пра каго найчасцей пісалі замежныя СМІ ў дачыненні Беларусі?**




* Лічбы ў гэтым і наступных графіках акругленыя да цэлых.

Маніторынг замежных медыяў адлюстраваў, што большасць артыкулаў асвятлялі падзеі ў Беларусі праз прызму вайны ва Украіне, а таксама праз геапалітычны кантэкст. Палітычны крызіс у краіне і ўнутрыпалітычныя падзеі цікавілі замежных журналістаў нашмат радзей (гл. графік 2). Акрамя таго, Беларусь згадвалася ў кантэксце спартыўных падзеяў, напрыклад падчас абмеркавання ўдзелу беларускіх спартоўцаў у Алімпіядзе-2024.

**Графік 2: Тэмы, у кантэксце якіх згадвалася Беларусь у замежных СМІ**




## ВОБРАЗ БЕЛАРУСАЎ У ЗАМЕЖНЫХ ВЫДАННЯХ

Агульны вобраз беларусаў даволі моцна змяніўся ў параўнанні з вынікамі мінулага маніторынгу. У 46% прааналізаваных выпадкаў беларусаў агулам называюць агрэсарамі (гл. графік 3). Найбольш гэта характэрна для польскіх і ўкраінскіх выданняў, найменш – для брытанскіх. Аднак калі гаворка ідзе пра беларусаў унутры краіны, часцей за ўсё выкарыстоўваецца вобраз ахвяраў рэжыму. У параўнанні з мінулым выданнем маніторынгу нязначна вырасла колькасць артыкулаў, дзе беларусаў у Беларусі называюць прыхільнікамі Расеі. Найбольш часта такое меркаванне сустракаецца ў польскіх і ўкраінскіх, а таксама японскіх СМІ.

**Графік 3: Вобраз беларусаў агулам**



**Графік 4: Вобраз беларусаў у Беларусі**




Беларусы замежжа сталі героямі 3% прааналізаваных артыкулаў. Найчасцей дыяспара згадвалася ў кантэксце палітычных акцый за мяжой і пытанняў легалізацыі беларусаў. Акцыі беларусаў часцей за ўсё цікавілі журналістаў амерыканскіх выданняў, а пытанні легалізацыі больш фігуравалі ва ўкраінскіх і польскіх выданнях. Акрамя таго, замежныя журналісты згадвалі дыяспару ў агульным кантэксце, прыводзячы лічбы  беларусаў, якія выехалі з краіны праз палітычны крызіс.

**Графік 5: Беларусы ў эміграцыі**




# БЕЛАРУСЬ VS “БЕЛАЯ РАСЕЯ”?

Калі ў першай рэдакцыі маніторынгу выданні на іспанскай, партугальскай, шведскай, нямецкай мовах дастаткова часта выкарыстоўвалі назву-адпаведнік “Белая Расея”, то ў другой моўныя адпаведнікі “Белай Расеі” былі амаль незаўважныя. У выбарку гэтага маніторынгу не трапілі медыі на іспанскай, партугальскай і скандынаўскіх мовах (апошнія і раней выкарыстоўвалі назву Belarus), таму зрабіць статыстычна значнае  параўнанне мы не можам.

Аднак калі звярнуцца да асобных прыкладаў, можна заўважыць, што ў германскіх мовах выкарыстанне адпаведнікаў “Белай Расеі” змяншаецца, а ў раманскіх – захоўваецца. Так, у прааналізаваных нямецкіх выданнях (якія трапляли ў выбарку кожны год) колькасць выпадкаў выкарыстання Weissrussland у межах аднаго артыкула зменшылася з 7% у маніторынгу 2020/21 гг. да 2% у 2022/23. Зусім не карыстаюцца старой назвай Vitryssland і шведскія выданні, да якіх не так даўно часткова далучыліся дацкія медыі. Тым не менш адпаведнікі выразу “Белая Расея” дамінуюць у нарвежскіх буйных выданнях. Таксама і медыі на раманскіх мовах, якія мы аналізавалі ў мінулай рэдакцыі (El Mundo, Folha de S.Paulo), разам з іншымі папулярнымі іспана- і партугаламоўнымі выданнямі працягваюць выкарыстоўваць назвы-адпаведнікі “Белая Расея” альбо “Беларусія” ў абсалютнай большасці выпадкаў.

# КАГО ЗАМЕЖНЫЯ СМІ НАЗЫВАЮЦЬ ПРЭЗІДЭНТАМ БЕЛАРУСІ?

Лукашэнка згадваецца ў 30% прааналізаваных артыкулаў, і як бачна з графіка 6, часцей за ўсё замежныя СМІ называюць яго прэзідэнтам ці дыктатарам. Прэзідэнтам Лукашэнку найчасцей называлі ў выданнях з Японіі (93%), Францыі (69%), ЗША (63,5%) і Вялікабрытаніі (52%)[1]. Як нелегітымнага прэзідэнта Лукашэнку абазначалі ў палове ўкраінскіх артыкулаў. Эпітэты “дыктатар” і “аўтакрат” часцей за ўсё таксама выкарыстоўваліся ва  украінскіх, а яшчэ і ў польскіх выданнях. Нарэшце, у Германіі журналісты найчасцей абіралі словы “лідар” ці “кіраўнік Беларусі” (60% ад агульнай колькасці нямецкіх артыкулаў пра Лукашэнку).

У адрозненні ад Лукашэнкі Ціханоўская займала нашмат менш месца ў медыйнай прасторы замежжа. Яе асобу згадвалі ў 4,6% прааналізаваных артыкулаў. Ціханоўскую часцей за ўсё (75%) называюць лідаркай дэмакратычных сілаў і радзей прэзідэнт-электам (4%). Прэзідэнткай Беларусі Ціханоўскую называлі толькі ў польскіх выданнях, а вось у нямецкіх выданнях Ціханоўскую зрэдку апісвалі як праваабарончую актывістку (аднак такія артыкулы складаюць толькі 0,3% выбаркі).

**Графік 6. Аляксандр Лукашэнка**




**Графік 7. Святлана Ціханоўская**




1 Адсотак ад усіх праналізаваных па краіне артыкулаў, дзе згадваецца Лукашэнка. Напрыклад, у 52% такіх матэрыялаў  з брытанскіх выданняў выкарыстоўваўся назоўнік “прэзідэнт”.

# ВОБРАЗ УЛАДАЎ БЕЛАРУСІ І ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛАЎ

Дэмакратычныя сілы агулам згадваліся ў 6% прааналізаваных матэрыялаў, што трапілі ў выбарку, і ў большасці з іх захоўваецца вобраз “апазіцыі ў выгнанні з моцнымі міжнароднымі сувязямі”. Выбіваецца вобраз беларускіх дэмакратычных сілаў толькі ва ўкраінскіх медыях, якія часцяком апісваюць іх як раз’яднаныя структуры са слабым уплывам на сітуацыю ў Беларусі. Найбольш пазітыўны вобраз дэмакратычных сілаў адлюстраваны ў польскіх артыкулах, якія ў пяць разоў больш за іншыя матэрыялы характарызуюць дэмакратычныя сілы як моцныя і аб’яднаныя.

**Графік 8. Вобраз дэмакратычных сілаў**




Калі гаворка ідзе пра ўлады Беларусі, замежныя медыі часта малююць вобраз агрэсараў, асобаў і ўстаноў, якія нясуць пагрозу суседзям і жорстка кантралююць беларускае грамадства. Нейтральны вобраз уладаў Беларусі быў адзначаны толькі ў 7% артыкулаў. Аспекты, якія закранаюць міжнародныя выданні, гаворачы пра ўлады Беларусі, тычацца ў асноўным санкцый супраць рэжыму Аляксандра Лукашэнкі, а таксама пагаршэння стасункаў паміж рэжымам у Беларусі і Захадам.

**Графік 9: Улады Беларусі – Захад**




У кантэксце адносін з Украінай Лукашэнка часцей за ўсё апісваецца як пагроза. Акрамя таго, аўтары артыкулаў у польскіх, брытанскіх і ўкраінскіх выданнях у чвэрці выпадкаў крытычна звяртаюць увагу на тое, што Украіна падтрымлівала гандлёвыя стасункі з рэжымам Лукашэнкі на пачатку вайны. Апісваючы стасункі Лукашэнкі і Пуціна, большасць медыяў/журналістаў акрэсліваюць іх як сяброўскія (80%). Таксама ў матэрыялах з ЗША, Польшчы і Францыі часта сустракаецца метафара “Лукашэнка – марыянетка Пуціна”.

**Графік 10: Улады Беларусі – Украіна**




**Графік 11: Лукашэнка – Пуцін**




# ВАЙНА ЯК ГАЛОЎНАЯ ПРЫЗМА МЕДЫЙНАЙ УВАГІ ДА БЕЛАРУСІ

У адрозненне ад мінулага маніторынгу, у 2022-2023 гг. замежныя СМІ пісалі пра рэпрэсіі ў Беларусі абагульняльна. Найчасцей згадваліся палітычныя рэпрэсіі як працяглы феномен, унутрыпалітычны кантэкст. Замежныя СМІ пісалі і пра рэпрэсіі супраць беларускіх журналістаў. Таксама пад увагу трапілі затрыманні і прысуды рэйкавым партызанам. У параўнанні з леташнім маніторынгам у прааналізаваных медыях амаль не пісалі пра рэпрэсіі супраць беларускага бізнес-сектара.

У 2022-2023 гадах замежныя медыі радзей распавядалі пра дзеянні рэйкавых партызан, а таксама пра беларускіх добраахвотнікаў, якія ваююць на баку Украіны (2,6% ад агульнай колькасці матэрыялаў). Артыкулы нагадвалі пра дзеянні беларускіх рэйкавых партызан, а таксама расказвалі гісторыі пра добраахвотнікаў з Беларусі ў складзе ўкраінскай арміі. Журналісты надавалі ўвагу затрыманням рэйкавых партызан, крымінальным справам супраць байцоў палка Каліноўскага.

**Графік 12: Рэпрэсіі ў Беларусі**




Вайна стала адной з найбольш цэнтральных падзеяў, праз якія асвятлялася Беларусь у міжнародных СМІ. У адрозненне ад мінулага года, аднак, міжнародныя СМІ факусаваліся не столькі на саўдзеле рэжыму Беларусі ў расейскай ваеннай агрэсіі супраць Украіны, колькі на больш канкрэтных падзеях і навінах. Напрыклад, вялікую ўвагу замежныя выданні надавалі мяцяжу Прыгожына, уключанасці Лукашэнкі ў гэтыя падзеі, размяшчэнню войскаў ПВК “Вагнер” на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, СМІ абмяркоўвалі тэму пастаўкі ядравай зброі ў Беларусь.

Як і ў мінулым маніторынгу мы звярнулі ўвагу на тое, як асвятлялася стаўленне ўкраінцаў да беларусаў у кантэксце вайны. Так, у траціне артыкулаў агучваўся тэзіс аб тым, што большасць беларусаў падтрымліваюць у вайне Украіну. Адметна, што за год на 10% павялічылася доля артыкулаў, якія сцвярджаюць, што большасць беларусаў падтрымліваюць Расею. У мінулым маніторынгу гэтая лічба была меней за 1%, у гэтым – 11%. Акрамя таго, на 11% павялічылася доля матэрыялаў, якія адзначаюць, што ўкраінцы лічаць беларусаў варожай нацыяй. Часцей за ўсё гэтае меркаванне выказвалася ў польскіх і ўкраінскіх выданнях. Цікава, што ва ўкраінскіх СМІ ў параўнанні з мінулым годам больш заўважная ідэя аб тым, што ўкраінцы ўдзячныя за падтрымку тых беларусаў, якія дапамагаюць Украіне.

**Графік 13: Вайна**



# ВЫСНОВЫ

Маніторынг медыйнага вобраза Беларусі ў замежных СМІ дазваляе нам зрабіць некалькі высноваў, звязаных са зменай асвятлення Беларусі.

- Па-першае, увага да Беларусі працягвае змяншацца. Гэта адлюстроўваецца як у зніжэнні колькасці артыкулаў пра Беларусь, так і ў больш павярхоўным асвятленні падзеяў (гэта вынікае з якаснай ацэнкі нашай даследчай каманды). У некаторых выданнях, што траплялі ў наш маніторынг цягам апошніх трох год, колькасць артыкулаў пра Беларус знізілася ў 5 разоў. Гэта тычыцца перадусім заходнееўрапейскіх і амерыканскіх СМІ. Акрамя таго, рыхтуючы матэрыялы пра ўцягнутасць Беларусі ў падтрымку вайны на баку Расеі, журналісты замежных выданняў абмінаюць унутрыпалітычны кантэкст у краіне пасля 2020-га года, не згадваюць супраціў дэмакратычных сілаў і беларускага грамадства.

- Штораз меншую ўвагу да Беларусі ў замежных СМІ можна патлумачыць большай колькасцю “гарачых” падзеяў у свеце, што прыводзіць да скарачэння медыйнага жыцця навінаў агулам.

- Жыццё беларускага грамадства цікавіць замежныя медыі нашмат менш, чым дзеянні рэжыму, наступствы якіх могуць уплываць і на развіццё падзеяў у рэгіёне. Увага да беларускай сітуацыі, хутчэй за ўсё, будзе падаць яшчэ больш на фоне блізкіх выбараў у Расеі, у ЗША, ЕС.

- Па-другое, нягледзячы на тое, што ў 2023-ім годзе палітыкі Польшчы і Швецыі назвалі Святлану Ціханоўскую прэзідэнткай-электам, большасць медыяў апісваюць яе як актывістку ці лідарку беларускіх дэмакратычных сілаў. Аднак так Ціханоўскую міжнародныя СМІ называлі і раней, што нельга сказаць пра Лукашэнку. У гэтым выданні маніторынгу мы бачым трэнд на павышэнне колькасці артыкулаў, якія называюць Лукашэнку прэзідэнтам Беларусі. Пры гэтым частка выданняў дадае слова “нелегітымны” ці называе Лукашэнку “дыктатарам”. Калі б нашае даследаванне ахоплівала большую колькасць замежных медыяў , чым у актуальнай версіі, то доля артыкулаў, якія называюць Лукашэнку прэзідэнтам, верагодна была б большай. Трэба зазначыць, што ў папярэдніх выпусках маніторынгу мы праводзілі інтэрв’ю з прадстаўнікамі дэмакратычных сілаў і з журналістамі, якія пацвярджалі наяўнасць моцных і ўстойлівых кантактаў адно з адным. Гэтыя сувязі могуць выкарыстоўвацца для заклiку да больш якаснага, дакладнага і глыбокага асвятлення палітычных падзеяў у Беларусі.

- Па-трэцяе, у прааналізаваных медыях заўважны рост матэрыялаў, якія называюць беларусаў прыхільнікамі Расеі. Хоць гэта часткова суадносіцца з вынікамі сацыялагічных апытанняў, такі вобраз не грае на руку беларусам. Моцны ўплыў вобраза агрэсараў і прыхільнікаў Крамля ўжо меў пазамедыйны эфект. Напрыклад, у Літве разгарэўся скандал праз спрэчку ў бары, пра што напісалі мясцовыя СМІ, а пазней гэта стала прадметам высокаўзроўневых палітычных дэбатаў. Улічваючы існыя сувязі беларусаў замежжа з журналістамі краін, у якіх яны пражываюць, падкрэсленне альтэрнатыўнага вобраза беларусаў як прыхільнікаў незалежнасці і еўрапейскіх каштоўнасцяў, можа стрымліваць непрыязныя для беларусаў палітычныя рашэнні.

# МЕТАДАЛОГІЯ МАНІТОРЫНГУ

У кантэксце якіх падзеяў Беларусь згадваецца ў першую чаргу? Чым адрозніваецца асвятленне Беларусі ў розных краінах? Для адказу на гэтыя пытанні мы зладзілі якасны кантэнт-аналіз 20 выданняў з 8 краінаў.

| *Краіна* | *Прааналізаваныя выданні і колькасць артыкулаў* | *Колькасць артыкулаў (усяго: 7505)* |
|---|---|---|
| Агульнаеўрапейскае выданне (галоўны офіс знаходзіцца ў Бельгіі) | Euronews | 236 |
| Вялікабрытанія | BBC UK<br>The Guardian<br>The Independent | 39<br>245<br>262 |
| Германія | Die Zeit<br>Deutsche Welle | 333<br>40 |
| ЗША | Washington Post<br>The Hill<br>NPR<br>CBS News<br>New York Times<br>CNN | 66<br>152<br>134<br>70<br>325<br>35 |
| Літва | Delfi LT | 16 |
| Польшча | Rzeczpospolita<br>Wyborcza | 1024<br>997 |
| Францыя | Le Monde<br>Figaro | 227<br>586 |
| Украіна | Українська правда<br>УНІАН | 763<br>1680 |
| Японія | NHK | 275 |

Для маніторынгу вобраза Беларусі ў замежных СМІ мы выкарысталі якасны кантэнт-аналіз, які праводзіўся згодна з працэдурамі метаду паводле Маргрыт Шраер (2012). Метад якаснага кантэнт-аналізу дазваляе эфектыўна і сістэматычна апісаць масіў другасных дадзеных. Пры гэтым стварэнне кодавай сеткі, з дапамогай якой сістэматызуюцца дадзеныя, патрабуе глыбокага папярэдняга вывучэння матэрыялу і якаснага падыходу да групавання і называння дадзеных. Аналіз пачаўся з дэталёвага вывучэння аднаго з выданняў, на падставе чаго былі сфармаваныя першасныя катэгорыі і падкатэгорыі. Пасля гэтага было праведзена пілотнае кадаванне некалькіх дзясяткаў артыкулаў з розных выданняў, што стала асновай для валідацыі і перагляду кодавай сеткі. У выніку мы спыніліся на тэматычных катэгорыях, якія адпавядаюць крытэрам кодавай сеткі паводле метаду (аднамернасць, узаемная выключнасць і насычанасць), а таксама шырока і вычарпальна характарызуюць збор артыкулаў для аналізу (Шраер, 2012, раздзел 4). У аналізе медыявыданняў, які праводзіўся цягам двух месяцаў, удзельнічалі 12 даследчых асістэнтаў. Усе з іх прайшлі папярэднюю метадалагічную падрыхтоўку, валодаюць адной з моваў аналізу на свабодным узроўні. Пасля завяршэння сістэматызацыі артыкулаў мы правялі аналіз дадзеных з дапамогай SPSS.

Як і ў мінулым даследаванні фокусам медыяаналізу застаюцца галоўныя заходнія СМІ. Пры гэтым, дзеля выяўлення магчымых адхіленняў і будучага вывучэння медыявобраза Беларусі ў іншых краінах і культурах, сёлета мы ўключылі ў аналіз папулярныя выданні Японіі і Украіны. У краінах з буйнымі медыявыданнямі, якія шмат пішуць пра Беларусь (да прыкладу, Польшча, ЗША, Германія ці Вялікабрытанія), мы аналізавалі некалькі медыяў. У будучыні мы будзем імкнуцца пашырыць выбарку для якаснага медыяаналізу, каб ахапіць большую колькасць медыявыданняў і краінаў. Пры гэтым асноўным прынцыпам працы застаецца якасць. Для аналізу большасці СМІ мы набывалі прэміум-падпіску, каб ахапіць усе даступныя артыкулы за патрэбны перыяд. Перыяд аналізу (14-га ліпеня 2022 – 13-га ліпеня 2023) абгрунтаваны храналагічнай працягласцю аналізу мінулага года (леташні аналіз ахопліваў перыяд 14-га ліпеня 2021 – 13-га ліпеня 2022. У выбарку траплялі артыкулы, якія згадвалі Беларусь (а таксама аднакарэнныя словы на мовах артыкулаў) як у загалоўку, так і ў асноўным тэксце артыкула. У выніку ў нашу выбарку за абраны перыяд з 20 абраных выданняў трапілі 7505 артыкулаў (амаль на 2 000 менш, чым за аналагічны перыяд у мінулым годзе).

Важна адзначыць, што нашае даследаванне дазваляе акрэсліць пэўныя трэнды ў асвятленні Беларусі, яе палітычных актараў і грамадзян замежнымі СМІ. Пры гэтым выбарка не з’яўляецца выпадковай ці цалкам рэпрэзентатыўнай. Дзеля рэпрэзентатыўнага колькаснага даследавання медыявобраза Беларусі патрабуецца выкарыстанне аўтаматычнага збору і аўтаматычнай апрацоўкі вялікай колькасці звестак. Метад дадзенага аналізу факусуецца на якасным аналізе і выяўленні трэндаў. З гэтай нагоды графікі ў даследаванні варта хутчэй успрымаць як ілюстрацыю трэндаў у асвятленні Беларусі, чым як рэпрэзентатыўныя колькасныя паказнікі.

# ПРА АЎТАРКУ



**Леся Руднік –** дырэктарка Цэнтра новых ідэй, паліталагіня, дактарантка Karlstad University ў галіне палітычных навук.

https://newideas.center/authors/alesia-rudnik-by/

*Аўтарка даследавання выказвае падзяку даследчым асістэнтам: Вользе Стасевіч, Ганне Маргуновай, Ганне-Марыі Лебядзеўскай, Алесі Кананчук, Аляксею Пятрэнку, Герману Забаронку, Уладзіміру Мазуру, Мікіту Чайкоўскаму, Дзянісу Рабчуку.*

---

ЦЭНТР НОВЫХ ІДЭЙ

**Цэнтр новых ідэй –** аналітычны цэнтр, дзейнасць якога прысвечаная магчымасцям развіцця і адказам на выклікі, якія стаяць перад Беларуссю ў XXI стагоддзі. Нашая місія ў тым, каб дапамагчы палітычным і грамадскім арганізацыям пабудаваць больш адкрытую, заможную і ўстойлівую Беларусь.

https://newideas.center

Фота: Павел Крычко